# АЗНАЯМЛЕННЕ З МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРАЙ ДЗЯЦЕЙ СЯРЭДНЯГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

**Д.М. Дубініна**

Літаратурныя творы для дзетак ад 4 да 5 гадоў вызначаюцца разнастайнасцю жанраў, тэм, сюжэтаў. У пласт дзіцячага чытання дзяцей сярэдняга дашкольнага ўзросту уваходзяць малыя формы фальклору, казкі, вершы, апавяданні. Вызначальным спосабам работы ў працэсе сенсаў актывізуючых зносін выступае дыялог. Дыялагічныя зносіны – гэта багатая думкамі адвольная кантэкстная гаворка, асобаснае ўзаемадзеянне паміж дарослым і дзіцём, *змястоўныя зносіны.*

Казкі для дзяцей сярэдняга дашкольнгага ўзросту вызначаюцца сваёй грунтоўнасцю і малюнкавасцю. Часцей для расказвання дзеткам выкарыстоўваюцца казкі пра жывёл, дзе жывёлы выступаюць носьбітамі пэўных якасцей, якія ўласцівы і чалавеку. У гэтым ўзросце казка выступае для дзіцяці як падказка, дарадчык добрых спраў. У працэсе знаёмства дашкольнікаў з казкамі асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на здольнасць малых да суперажывання, дапамагчы ім правільна ўспрыняць казку і зразумець дзе дабро, а дзе зло.

Што да апавяданняў,то дзеці здольны ўжо прасачыць за ходам падзей ў творы, выказаць сваю думку наконт яго герояў, хаця яшчэ іх жыццёвы вопыт і невялікі. У працэсе зносін дарослы прапаноўвае дзецям выбраць найбольш спадабаўшыяся ўрыўкі для паўторнага чытання. Выбар ўрыўка дзецьмі паказвае даросламу як слухачы зразумелі мастацкі твор. З сярэдняга дашкольнага ўзросту можна выкарыстоўваць і такія прыёмы, як пераказ мастацкага твора, яго драматызацыя, мадэляванне.

Ва ўзросце ад 4 да 5 гадоў звяртаецца ўвага дзяцей на вобразную мову мастацкіх твораў. У працэссе расказвання і чытання мастацкіх твораў даросламу неабходна вызначаць найбольш яркія ў вобразных адносінах словы і фразы, прадстаўляць дзецям магчымасць ўзнавіць іх у сваім маўленні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Завучванне вершаў дзецьмі сярэдняга дашкольнага ўзросту мае сваю спецыфіку. Спачатку пажадана падрыхтаваць дзяцей да ўспрымання паэтычнага твора. Затым педагог выразна чытае верш. Пасля першага чытання праводзіцца невялікая тлумачальная гутарка па змесце і форме паэтычнага твора, затым выхаванцаў папярэджваюць аб тым, што яны будуць завучваць верш напамяць. Пасля паўторнага чытання верш распавядаюць дзеці. Тлумачальная гутарка па змесце і форме вершаванага твора спалучаецца з практыкаваннямі на запамінаннне і выразнае чытанне ўрыўкаў, спрыяе асэнсаванню тэкста дзецьмі. Якасць выразнага выканання верша дзецьмі залежыць ад яго шматразовага паўтарэння на працягу пэўнага часу.

**Знаёмства з творамі фальклору**

*Завучванне заклічкі «Сонейка-сонца, выглянi ў аконца»*

*Расказванне казкі “Каток — залаты лабок”*

*Расказванне казкі “Пшанічны каласок”*

*Расказванне казкі* “Піліпка-сынок”

*Расказванне казкі* “Каза-манюка”

*Расказванне казкі* “Сынок-з-кулачок”

Знаёмства з літаратурнымі казкамі

*Расказванне вершаванай казкі М. Танка “Галінка і верабей”*

*Расказванне літаратурнай казкі “Страшная казка пра страшнага звера” Івана Бурсава*

Тэма. Поры года

*Расказванне верша Я. Купалы “Лістапад”*

*Завучванне верша І. Муравейка “Восенню ў садзе*

*Расказванне верша А. Дзяружынскага “Сняжынкі”.*

*Расказванне верша С. Шушкевіча “Нашы сябры”*

*Завучванне верша К. Цвіркі “Коцікі”*

*Завучванне верша Я. Коласа “Вясна”*

*Завучванне верша А. Дзяружынскага “Пралеска”*

*Завучванне верша А. Прохарава «Мурашыная святліца»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Завучванне верша С. Сокалава-Воюша «Возера лясное”*

Тэма. Мая сям’я

*Чытанне апавядання* Васіля Віткі “Натальчына сямейка”

*Чытанне апавядання Васіля Хомчанка “Яблык”*

*Чытанне апавядання* Васіля Хомчанка “Яшава рукавічка”

*Чытанне апавядання Барыса Сачанка “Настачка”*

*Расказванне верша Р. Барадуліна “Ай, Не буду! Не хачу!”*

*Расказванне верша Р. Барадуліна “ Ната маму любіць надта”*

*Расказванне верша В. Вярбы “ Бабуліны казкі”*

Тэма. Дзіцячы сад

*Расказванне вершаў “Працавітая дзяўчынка”, “Як зроблены цацкі”*

*Чытанне апавядання Уладзіміра Юрэвіча “Пацалунак асвы”*

*Расказванне вершаў “Наш дзень”, “Дашын карандашык”*

*А. Александровіча*

Тэма. Птушкі

*Завучванне верша А. Дзеружынскага “Бусел і хлопчык”*

Тэма. Радзіма

*Расказванне верша А. Вольскага “Радзіма”*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Беларуская дзіцячая літаратура. Хрэстаматыя / Аўт.- ўклад. М. Ф. Шаўлоўская. – Мн.: 2003.

2. Вітка В. Урокі роднага слова: Вершы, казкі, апавяданні: Для мал. Шк. Узросту / В. Вітка; Уклад. Т. С. Тарасава; -- Мн.: 2001.

3. Залатыя каласкі. Чытанка для дзяцей. Ч. 1; Ч. 2; / Пад рэд. С.С. Лаўшука.—Мн.: 1994. 4.

4. Чытанка для дзіцячага сада / Уклад. В.Р. Вячорка і інш.,-- Мн.: 1990.

5. Хрестоматия для дошкольников: в четырех частях. Часть 4. Произведения малых фольклорных форм / сост. А. И. Саченко, Л. А. Саченко. - 2006 - 187 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ